*Гоўзіч І.М.*

***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



## ТЭМА 10. ГЕНРЫХ БЁЛЬ

1. Падрыхтуйце **паведамленне** пра жыццёвы і творчы шлях Генрыха Бёля, адзначыўшы ў ім:

*— агульную грамадска-гістарычную характарыстыку часу, на які прыпадае творчасць пісьменніка;*

*— асноўныя асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу;*

*— жыццёвы шлях пісьменніка (звесткі з біяграфіі, грамадзянская пазіцыя, уплыў сацыякультурнага кантэксту на творчасць і г.д.);*

*— творчы шлях пісьменніка (пачатак літаратурнай дзейнасці, этапы ці перыяды творчай эвалюцыі, агульная характарыстыка мастацкіх асаблівасцей найбольш значных твораў, кніг, зборнікаў);*

*— значэнне творчасці пісьменніка для развіцця беларускай літаратуры (у тым ліку ацэнкі яго сучаснымі літаратуразнаўствам, крытыкай), суаднесенасць з сусветным літаратурным працэсам.*

2. **Падбярыце эпіграф** з твораў беларускіх пісьменнікаў, творчасць якіх вывучалася ў 10 ці 11 класе, які раскрывае своеасаблівасць стылю Г.Бёля.

3. Г. Бёля называюць пісьменнікам «пакалення, якое вярнулася» (разам з Вольфгангам Борхертам, аўтарам вядомай драмы «За дзвярыма», 1947). Іх параўноўваюць з тымі, хто вярнуўся з Першай сусветнай, – са «страчаным пакаленнем». **Правядзіце паралель паміж пакаленнем**, якое вярнулася, і страчаным пакаленнем. Падрыхтуйце **паведамленні** пра іх прадстаўнікоў.

4. Правядзіце **міні-дыспут** па пытанні: «Ці з'яўляецца актуальным змест рамана Г. Бёля, напісанага ў 1954 годзе? ».

5. У беларускім тэксце рамана, які выйшаў у 1996 годзе ў серыі «Школьная бібліятэка», **шмат памылак**. Ці **заўважылі** вы іх? І ці здаецца вам памылкай або як вы маглі б **растлумачыць няправільна напісанае слова** ў двух месцах рамана: «У суправаджэнні экзістэнцыяльных гукаў аргана» (с. 24), «...і ты магла б там унізе накруціць уласны экзістэнцыяналістычны фільм (с. 104). Як гэтае слова павінна гучаць правільна? І што яно азначае? І колькі, на вашу думку, каштуе непрафесійнасць?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. **Напішыце ліст у сучаснасць** ад імя Марціна Баха, сына Раймунда і Нэлы, і Генрыха Брылаха, сын Вільмы і Генрыха. Ці будуць адрозніваца гэтыя лісты.

7. Пералічыце імёны вядомых беларускіх пісьменнікаў, якія, падобна Г. Бёлю, часта карыстаецца прыёмамі стварэння ўнутраных маналогаў пры паказе духоўнага стану герояў, і назавіце іх творы.

8. Падрыхтуйце **мультымедыйную прэзентацыя на тэму «Дзяцінства абвінавачвае»** на матэрыяле сусветнай і беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ